**А. Міхалевіч**
*дырэктар радыёстанцыі «Сталіца»*

## «СТАЛІЦУ» СЛУХАЕ ЎСЯ КРАІНА

З моманту свайго нараджэння – 21 верасня 1998 года – калектыў радыёстанцыі прытрымліваецца прынцыпу «Радыё “Сталіца” – наша радыё». У тыя часы перад журналістамі стаяла нялёгкая задача: ства-

рыць дзяржаўную беларускамоўную радыёстанцыю, здольную канкурыраваць з недзяржаўнымі радыёстанцыямі. І цяпер з гонарам можна адзначыць: калектыў «Сталіцы» з гэтай задачай справіўся, даказаўшы, што дзяржаўнае радыё можа быць і прэстыжным, і канкурэнтаздольным. Значным фактарам прыцягнення аўдыторыі з’яуляецца і той факт, што станцыя сёння даступная слухачам усёй краіны.

Штодзённа радыё «Сталіца» суправаджае сваіх слухачоў 20 гадзін: з 06:00 да 02:00 на ўльтракароткіх хвалях – УКХ 72.89 і ў рэжыме рэальнага часу ў інтэрнэце. За 12 год творчай біяграфіі радыёстанцыя набыла сталых і, самае прыемнае, зацікаўленых слухачоў.

Зараз радыё «Сталіца» мае ўстойлівую аўдыторыю з высокай ступенню даверу да сваіх праграм. Шырокія магчымасці сучаснага радыёэфіру і зацікаўленасць аўдыторыі патрабуюць ад нас павышэння прафесійнага ўзроўню, аператыўнага ўдасканалення сеткі вяшчання і, самае галоўнае, уключэння ў эфір больш інфармацыйных, аналітычных і пазнавальных праграм.

У штаце радыёстанцыі – кваліфікаваныя спецыялісты, гэта калектыў аднадумцаў, якія знаходзяцца ў пастаянным творчым пошуку. Адметнасцю з’яўляецца і тое, што на хвалях «Сталіцы» вельмі шырока асвятляецца жыццё Мінска, Мінскай вобласці і рэспублікі ў праграме «Сёння і заўтра», якую рыхтуюць Ала Рыжэвіч, Алена Лычагіна і Ігар Емельяновіч. Гэтая праграма выходзіць таксама і на хвалях Першага нацыянальнага канала.

За апошнія гады істотна змяніўся эфірны твар радыёстанцыі. І выклікана гэта не толькі тымі задачамі, якія мы, як структура Беларускага радыё, абавязаны вырашаць: расказваць пра палітыку кіраўніцтва краіны, асвятляць усе значныя падзеі, прапагандаваць беларускую культуру, павышаючы такім чынам інфармаванасць аўдыторыі і яе інтэлектуальны ўзровень. Справа яшчэ і ў тым, што ў эфірнай прасторы краіны, асабліва ў сталіцы, існуе каля двух дзесяткаў недзяржаўных, камерцыйных радыёстанцый, а таму «Сталіца» абавязаны мецць менавіта свой арыгінальны стыль, вытрымліваць аптымальныя прапорцыі інфармацыйна-аналітычнага, культурна-пазнавальнага і музычнага вяшчання. Сёння журналісты як ніколі адчуваюць, што да слухача трэба адносіцца з вялікай павагай, бо ён патрабуе не толькі і не столькі музыкі і забаў у эфіры, але і сур’ёзнай размовы пра надзённае, аператыўных навін. Дарэчы, з новага сезона пачаўся пераход да штогадзінных выпускаў навін.

Галасы вядучых эфіру з раніцы і да позняга вечара нясуць добры і пазітыўны настрой, зарад бадзёрасці, а таксама музыку як розных сучасных накірункаў, так і творы мінулых часоў. Сацыяльна значныя аўтарскія праекты «Землякі», «Сельскі напрамак», «Доблесць», «Маладзёжны праспект», «Школа мільянера» рыхтуюць супрацоўнікі службы інфармацыі Алена Барздыка, Пятро Варахобін, Ігар Емельяновіч, Алена Лычагіна, Алесь Праўдзін, Ала Рыжэвіч. Пра спартыўныя перамогі кожны дзень у выпусках «Сталіца-спорт» расказвае спартыўны каментатар Аляксей Тэрра.

Сваіх слухачоў знайшлі і такія праграмы, як «Пятае кола», «Тур па Беларусі», «Краіна футболу», «Шоу ў пясочніцы», «Экзотыка», «Аднойчы з песняй», «Дамашняя акадэмія», «У адзіным экзэмпляры», «Сталічны калейдаскоп», «Абарваная струна», «Не сумуй», «Сталічная дыскатэка», «Дзённы кінасеанс», «Спакойна, вы ў эфіры» і іншыя.

Сёлетні вяшчальны сезон падарыў слухачу новыя праграмы і праекты, а таксама сустрэчы з ужо знаёмымі перадачамі, якія выйшлі ў эфір у абноўленым фармаце. Сярод новых – «Знак якасці» (пра палітыку дзяржавы ў галіне якасці), «Без бар’ераў» (аб стварэнні безбар’ернага асяроддзя і рэабілітацыі інвалідаў), «Пытанні пра Беларусь» (сумесная з Інстытутам гісторыі, мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора Нацыянальнай акадэміі навук інфармацыйна-пазнавальная праграма), «Асоба» (інфармацыйна-публіцыстычная праграма пра вядомых людзей), «Ну і дзянёк» (інтэрактыўная музычна-пазнавальная), «Музычны паядынак» (інфармацыйна-забаўляльная), «Культурная сфера» (культурна-асветніцкая праграма). Абноўлена ранішняе сямейнае інтэрактыўнае шоу «Раніца ў нядзельку». Зменена структура музычна-забаўляльнага вяшчання. Па буднях з 7.00 да 12.00 гучыць інфармацыйна-музычны канал «Ранішні кактэйль».

Гучанне большасці нашых праграм у прамым эфіры, тэлефонная сувязь са слухачамі, выкарыстанне папулярнага СМС-сервісу і наяўнасць на сайце станцыі гасцявой кнігі дазваляюць у поўным сэнсе слова трымаць пастаянную і жывую сувязь з аўдыторыяй, даваць магчымасць слухачам удзельнічаць у размовах з героямі перадач.

У гэтым сэнсе паказальнай з’яўляецца праграма «Месца сустрэчы – радыё «Сталіца». Слухач разам з вядучым становіцца сааўтарам размоў з палітычнымі дзеячамі, кіраўнікамі арганізацый і ўстаноў, прадстаўнікамі дыпламатычных місій, навукоўцамі. Поспех праграмы і ў тым, што для

абмеркавання выносіцца тэма, якая цікавіць нас менавіта сёння. А гэта могуць быць праблемы развіцця нацыянальнага кінематографа або эпідэміялагічнай абстаноўкі, стасункі Рэспублікі Беларусь з сусветнай супольнасцю і суседнімі краінамі, праблемы будаўніцтва АЭС альбо добраўпарадкавання населеных пунктаў.

Сёння відавочна: істотнае павелічэнне інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання і колькасці пазнавальных праграм стала складнікам замацавання за радыёстанцыяй іміджу сур’ёзнай і рэспектабельнай. Натуральна, што павелічэнне аб’ёму «сур’ёзных» праграм не адбілася на музычнай палітыцы, якая па-ранейшаму вызначаецца імкненнем не проста перадаваць музыку, але рабіць гэта сістэмна, праз тэматычныя праграмы і канцэрты, з улікам пажаданняў слухачоў. У гэтым таксама вялікае і станоўчае адрозненне «Сталіцы» ад даволі распаўсюджанага сярод нашых многіх радыёстанцый фармату Urban Hits Contemporary (фармат гарадскога хіта).

Галоўная ж задача радыё «Сталіца» – і надалей заставацца надзейнай, добразычлівай крыніцай інфармацыі на роднай мове, несці слухачам добрыя навіны і цудоўную музыку.